носьбітаў культуры – не вельмі адукаваных і нават малапісьменных, але поўнасцю адданых рэвалюцыі. Справа ўскладнялася тым, што нават і такіх кадраў не хапала. У адным з дакументаў гаварылася: “Калі мы і зараз запытаем сябе, што перашкодзіла і перашкаджае да сённяшняга часу рэальна правесці арганізацыю камуністычнага ладу, то мы зараз жа атрымаем адказ: “Няма людзей і таму не справіліся. Што ні пачынаеш рабіць, усюды адно і тое ж – няма людзей і баста!” Прапагандыстамі партыйнай ідэалогіі стала моладзь, новае пакаленне, якое з захапленнем падтрымала прывабныя заклікі. Ідэалагічная рэвалюцыя закранула амаль кожную сям’ю і прывяла да расколу тагачаснага грамадства на дзяцей і бацькоў, але не па ўзроставай, а па палітычнай прыкмеце. Спрадвечны канфлікт пакаленняў набывае палітычную афарбоўку.

Такім чынам, правячая Камуністычная партыя праз свае палітыка-асветныя ўстановы актыўна ўкараняла ў свядомасці грамадзян новыя прынцыпы і нормы паводзін, новыя духоўныя каштоўнасці. На працягу дзесяцігоддзяў фарміраваліся свядомасць і псіхалогія насельніцтва, якія характарызаваліся як станоўчымі, так і адметнымі рысамі, праяўляліся, праяўляюцца і, мабыць, будуць праяўляцца ў будучым.

**А.І.Смолік**, прафесар
Беларускага універсітэта культуры

## АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ АСОБЫ

Характэрнай асаблівасцю апошняй чвэрці XX ст. з’яўляецца развіццё працэсу самаарганізацыі культурнай дзейнасці. Назіраецца тэндэнцыя стварэння аматарскіх аб’яднанняў, культурных таварыстваў этнічных супольнасцей, новых устаноў клубнага тыпу. Культурнае жыццё беларускіх гарадоў і вёсак набывае новыя накірунак і змест на аснове ўдасканалення арганізацыйнай інфраструктуры ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў культуры. Многія з іх ператварыліся з забаўляльных устаноў у клубы, якія ставяць сваімі мэтамі далучэнне насельніцтва да розных відаў культурнай дзейнасці, задавальненне патрэб асобы ў самавыяўленні і самасцвярджэнні. Такія новыя тыпы клубных устаноў, як цэнтры рамёстваў, дамы фальклору і рамёстваў, школы народнай творчасці, аматарскія аб’яднанні, маюць добрую аснову для выкарыстання ў сваёй дзейнасці новых тэхналогій, метадаў і відаў мастацка-творчай рэабілітацыі, якія шырока распаўсюджаны ў розных краінах свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У разглядаемы перыяд у заходнееўрапейскіх краінах вялікую папулярнасць набыла дзейнасць па выкарыстанні прыкладных відаў мастацкай творчасці для творчага самавыяўлення асобы. Асабліва эфектыўным з'яўляецца метад арттэрапіі, які разглядаецца як эфектыўны сродак адаптацыі чалавека з дапамогай пластычнай выяўленчай творчасці. Тэрмін "арттэрапія" прапанаваны ў пачатку XX ст. рускім урачом А.І.Яроцкім для абазначэння спецыяльнага псіхатэрапеўтычнага метаду, які ўздзейнічае на асобныя бакі душэўнага жыцця чалавека [1]. Творчыя віды рэабілітацыі, і ў прыватнасці разьба па дрэве, чаканка, лепка, маляванне, выпальванне, выраб мазаікі, вітражоў, цацак з тканіны, гліны, актыўна ўкараняюцца ў практыку рэабілітацыйных цэнтраў, псіхіятрычных і агульнасаматычных шпіталяў, клінік, школ, турмаў, гета, універсітэтаў і іншых устаноў. У літаратуры, прысвечанай рэабілітацыйным функцыям прыкладных відаў мастацкай творчасці, падкрэсліваецца асаблівае значэнне мастацтва як гарманізуючага фактару. Далучэнне да мастацтва садзейнічае ўзбагачэнню духоўнага свету чалавека, стымулюе яго творчую актыўнасць і сацыякультурную дзейнасць.

Самадзейная выяўленчая творчасць, якая актыўна развіваецца ў рэгіёнах, найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы, з'яўляецца актыўнай формай далучэння насельніцтва да мастацтва. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях у 1997 г. існавалі 502 гурткі і майстэрні па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, у структуры аматарскіх аб'яднанняў шмат дамоў рамёстваў, студый жывапісу[2]. Аб размаху выяўленчай самадзейнасці сведчыць колькасць выстаў твораў народнай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія арганізоўваліся на Гомельшчыне і Магілёўшчыне. Толькі ў 1997 г. іх было праведзена 3420 [3]. Дарэчы, у сучаснай замежнай арттэрапіі дзеля павышэння адаптацыйных здольнасцей чалавека актыўна выкарыстоўваюцца аналіз і інтэрпрэтацыя хворымі ўжо існуючых твораў мастацтва. Таму наладжваемыя музеямі, клубамі, абласнымі грамадска-культурнымі цэнтрамі, дамамі вольнага часу, аддзеламі культуры выставы можна эфектыўна выкарыстоўваць для рэабілітацыі пацярпелага насельніцтва сродкамі мастацтва.

У даследуемы перыяд мастакі, калекцыянеры шэрага заходнееўрапейскіх краін часта практыкавалі арганізацыю выстаў у

---

[1] Яроцкий А. Идеализм как физиологический фактор.– Юрьев, 1998.

[2] Культурнае жыццё Рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі: Статыстыч. агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь за 1997 год. – Мн., 1998. – С. 32.

[3] Тамсама. – С. 43.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бальніцах, хоспісах. Вывучэнне лячэбнага ўздзеяння твораў мастацтва на людзей з неўратычнымі расстройствамі сведчыць: сузіранне твораў жывапісу, графікі дабратворна ўплывае на псіхафункцыянальны стан хворых. Аднак шматлікія назіранні і клінічныя доследы псіхатэрапеўтаў паказваюць, што розныя карціны не аднолькава ўздзейнічаюць на хворых. Так, М.Е.Бурно пры тэрапіі сродкамі выяўленчага мастацтва рэкамендуе выкарыстоўваць творы Рафаэля, Веласкеса, Гойі, Рубенса, Ван Дэйка, Лявіцкага, Шышкіна, Фёдарава, Леанарда да Вінчы, Батычэлі, Пусэна, Ван Гога, Пікаса, Далі, Шагала, Рабушкіна, Мікеланджэла, Брулова, Сурыкава, Малявіна [4].

М.Я. Лупічаў сцвярджае, што творы Батычэлі добра здымаюць балявы сіндром, карціны Матыса карысныя пры хваробе нырак, Пікаса – пры парушэннях у кары галаўнога мозга [5].

Музеямі даследуемага соцыуму кожны год наладжваецца шмат выстаў з уласных і іншых фондаў. Намі падлічана, што толькі за 1990 – 1997 гг. музеямі праведзена прыкладна 58 525 экскурсій, у якіх бралі ўдзел 1 170 500 чалавек [6]. Калі ўлічыць, што колькасць музеяў, карцінных галерэй значна павялічылася ў 90-х гадах, то можна сцвярджаць, што сацыякультурныя ўстановы маюць добрую магчымасць выкарыстоўваць гэтую форму дзейнасці ў рэабілітацыйных мэтах.

Артэрапеўты прыйшлі да высновы, што на хворых дабратворна ўплывае не толькі сузіранне твораў жывапісу, але ў яшчэ большай ступені непасрэдны ўдзел у маляванні, лепцы і іншых занятках. Шматлікія даследаванні клініцыстаў паказваюць, што маляванне дапамагае хвораму чалавеку перш за ўсё тым, што адцягвае яго ад перажыванняў прыемным эмацыянальным заняткам, які патрабуе затраты ўсіх – і эмацыянальных, і інтэлектуальных сіл. Расійскія псіхатэрапеўты Г.В.Буркоўскі і Р.Б. Хайкін падкрэслівалі камунікатыўную ролю сумеснага малявання. Яны адзначалі, што з яго дапамогай можна пераадолець фрустрацыю, змяніць самаацэнку чалавека [7].

---

[4] Бурно М.Е. Терапия творческим самовыражением. – М., 1989. – С. 137.

[5] Лупичев М.Я. Электропунктурная диагностика, гомеотерапия и феномен дальнодействия. – М., 1990. – С. 49.

[6] Падлічана на аснове аналізу статыстычных аглядаў тэатральна-відовішчных і культурна-асветніцкіх устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1990 – 1997 гг., змешчаных у зборніках "Культурнае жыццё Рэспублікі Беларусь".

[7] Бурковский Г.В., Хайкин Р.Б. Использование изобразительного творчества в психологической группе психических больных // Исследование механизмов и



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз самадзейнай творчасці Падняпроўя і Усходняга Палесся сведчыць аб тым, што ў гэтым рэгіёне яна існавала ў дзвюх формах: арганізаванай, дзе пэўная частка мастакоў-аматараў была аб'яднана ў студыі, гурткі, творчыя клубы, і ў форме самастойнай працы. Першая характарызуецца тым, што ў ёй самадзейныя аўтары працуюць у калектыўных аб'яднаннях пад непасрэдным кіраўніцтвам прафесійных ці вопытных самадзейных мастакоў. У гэтым выпадку маецца добрая магчымасць для арганізацыі праектыўнай арттэрапіі, задачай якой з'яўляецца атрыманне дадатковай інфармацыі аб праблемах асобных людзей ці групы ў цэлым. Праектыўны малюнак садзейнічае выяўленню і асэнсаванню цяжка вербалізуемых праблем і перажыванняў чалавека. Для праектыўнай арттэрапіі якасць не мае істотнага значэння. Тэмы, прапануемыя для малявання, могуць быць разнастайнымі і тычыцца як індывідуальных, так і агульных праблем.

У працэсе даследавання мы спрабавалі высветліць матывы звяртання шматлікай колькасці людзей посткатастрофнага соцыуму да самадзейнага выяўленчага мастацтва. У ходзе апытання высветлілася, што творчасць для большай масы самадзейных мастакоў з'яўлялася крыніцай арганізацыі вольнага часу. Пэўная частка апытаных самадзейных мастакоў сцвярджала, што мастацтвам сталі займацца невыпадкова, што патрэбнасць творчага самавыяўлення закладвалася яшчэ ў дзіцячыя гады, і толькі з прычыны сямейных, бытавых і іншых абставін не прадстаўлялася магчымасці прысвяціць дадатковы час любімаму захапленню. Ужо значна пазней, калі былі вырашаны многія жыццёвыя пытанні, з'явілася адчуванне вольнага часу і ўзніклі ўмовы для практычных заняткаў творчай дзейнасцю.

Другія самадзейныя мастакі выказвалі і абгрунтоўвалі разнастайнасцю фактаў меркаванне аб тым, што яны быццам адносяцца да "спадчыннай" катэгорыі людзей з прыроджанымі здольнасцямі да выяўленчай творчасці.

Група рэспандэнтаў сцвярджала, што патрэба ў творчай дзейнасці ў іх сфарміравалася праз працэс мастацкага афармлення насценных газет, лозунгаў, святочных транспарантаў ці праз капіраванне паштовак, рэпрадукцый з карцін вядомых майстроў жывапісу.

Адным словам, рухальнай сілай людзей да творчага працэсу з'яўлялася спантаннае жаданне сказаць сваё слова сродкамі

---

эффективности психотерапии при нервно-психических заболеваниях: Респ. сб. науч. тр. / Под ред. В.Е.Рожнева, Б.Д.Карвасарского. – Л., 1982. – С. 17.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацтва, адкрыць штосьці новае, рабіць са штодзённага прыгожае, цікавае, унутраная патрэба чалавека ў мастацкім самавыяўленні, рэалізацыі прыроднага таленту, толькі ў асабістых інтарэсах.

Амерыканскія арттэрапеўты Л.Гант і М.С.Шмаль адзначаюць, што, акрамя малявання, для самавыяўлення, самасцвярджэння і духоўнага ўзбагачэння асобы можна эфектыўна выкарыстоўваць іншыя прыкладныя віды мастацкай творчасці, якія добра развіты ў соцыуме. Палессе і Падняпроўе адметныя багаццем і разнастайнасцю рамёстваў, промыслаў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яно адлюстроўвае светапогляд людзей, прыўносіць духоўны пачатак у штодзённасць. У вывучаемым рэгіёне былі шырока развіты такія віды рамёстваў, як апрацоўка дрэва, чорных і каляровых металаў, ганчарства, вырабы з саломкі, лазы, бяросты, паперы, роспісы па дрэве, шкле, тканіне, ткацтва і вышыўка. Дзейнасць органаў і ўстаноў культуры Гомельскай і Магілёўскай абласцей была скіравана на адраджэнне і развіццё нацыянальнай традыцыйнай культуры. Жанр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва за даследуемы перыяд набыў шырокую папулярнасць сярод насельніцтва і падтрымку з боку ўстаноў культуры. У рэгіёне вялася работа па аб'яднанні народных майстроў і мастакоў-аматараў у клубы, студыі, майстэрні, аматарскія аб'яднанні, Дамы рамёстваў і цэнтры народных промыслаў. Асваенне традыцыйнага мастацтва ажыццяўлялася пры бібліятэках, музеях, школах і інш. Па статыстычных даных, у 1997 г. на Беларусі існавала 32 Дамы (цэнтры) рамёстваў, з іх 14 сельскіх; 30 Дамоў (цэнтраў) фальклору, з іх на сяле – 25; школ народнай творчасці – 40, з іх сельскіх – 39, гарадская – 1. Найбольшая колькасць новых тыпаў устаноў культуры існавала ў Гомельскай вобласці – 17 адзінак, з іх адзін раённы цэнтр фальклору (у Жыткавічах), 16 – сельскія [8].

Разгалінаваная сетка ўстаноў, дзе праводзіліся заняткі па асваенні традыцыйных і сучасных відаў мастацкай творчасці, дазваляе выказаць меркаванне аб тым, што ў сацыякультурных інстытутах даследуемага соцыуму маецца рэальная магчымасць выкарыстання ў рэабілітацыйных мэтах метаду гештальттэрапіі.

Прыём творчай работы для выяўлення і раскрыцця асобы праз мастацкія і стваральныя заняткі абгрунтаваў амерыканскі псіхатэрапеўт Ф.С.Перлс [9]. Гэты метад узнік у рэчышчы

---

[8] Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. – Мн., 1998. – Вып. 3. – С. 23.

[9] Perls F. Gestalttherapy verbatim. – Real People Press. Lafayette. – Calif., 1969.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

фенаменалагічнага падыходу, які патрабуе неабходнасці асэнсавання пацыентам існуючага і важнасці непасрэднага эмацыянальнага перажывання. Фенаменалагічны падыход гештальттэрапіі супрацьпастаўляўся традыцыйнаму падыходу, пры якім намаганні псіхатэрапеўта накіроўваліся на пошукі прычын расстройстваў у пацыента ў мінулым. Узнікненне і задавальненне патрэбнасцей Перлс і яго прыхільнікі разглядалі як рытм фарміравання і завяршэння гештальтаў. Функцыянаванне матывацыйнай сферы павінна ажыццяўляцца па прынцыпе самарэгуляцыі арганізма. Чалавек павінен знаходзіцца ў раўнавазе з самім сабой. Для захавання гармоніі неабходна толькі прыслухоўвацца да патрэбнасцей арганізма і не перашкаджаць іх рэалізацыі. Быць самім сабой, ажыццяўляць сваё “Я”, рэалізоўваць свае патрэбнасці, схільнасці, здольнасці – гэта шлях гарманічнай, здаровай асобы.

Парушэнне працэсу самарэгуляцыі, паводле аўтараў метаду гештальттэрапіі, назіраецца ў тых выпадках, калі якія-небудзь патрэбнасці не могуць быць задаволены па прычыне іх блакіравання сацыяльным асяроддзем, і тады энергія, назапашаная арганізмам для маніпулявання ў знешнім асяроддзі, накіроўваецца на самога сябе. У гэтым выпадку чалавек адмаўляецца ад рэалізацыі свайго “Я”. У выніку ўласныя мэты і патрэбнасці чалавека аказваюцца не задаволенымі, ён перажывае фрустрацыю, расчараванне і адчуванне бессэнсоўнасці існавання.

Нямецкі псіхатэрапеўт Е.Бініек абазначае тэрмінам “гештальттэрапія” тэрапеўтычнае ўмяшанне праз выяўленчыя паводзіны (Gestaltenlossen) [10]. Мэта гештальттэрапіі, паводле Е.Бініека, заключаецца ў тым, каб з дапамогай творчай дзейнасці абудзіць спантаннасць, арыгінальнасць, здольнасць раскрывацца душэўна.

Значыць, далучэнне да творчай дзейнасці неабходнае не само па сабе, а ў якасці перадумовы аднаго з магутнейшых сродкаў уздзеяння на фарміраванне ў хворых актыўнага супраціўлення захворванню.

У вызначаным кантэксце пад творчасцю разумеецца асобая форма творчай прадукцыйнай дзейнасці ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая адпавядае патрабаванням сацыяльнай рэабілітацыі і ў канчатковым выніку накіравана на аднаўленне дынамічнай раўнавагі сістэмы

[10] Biniek E.M. Psychotherapic mit gestalterischen Mitteln: e. Einf. In der Gestaltungstherapie. – Darmstadt: Wissenschaftliche Buchgesellschaft, 1982. – P. 172.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гомеастатычных самарэгулюемых механізмаў арганізма чалавека, пашкоджанага ў выніку стрэсавага ўздзеяння.

Такім чынам, вынікі зносін чалавека з творчасцю можна разглядаць не толькі як крыніцу абуджэння здольнасці ўспрымаць і ствараць прыгожае, але і глыбей: творчасць можна трактаваць як сродак развіцця не толькі спецыфічнай, але і універсальнай здольнасці, якая можа быць выкарыстана ў любой сферы чалавечай дзейнасці і пазнання. Навыкі, набытыя ў працэсе творчасці, чалавек можа пераносіць у працоўную, вучэбную, сацыяльную дзейнасць, сферу быту і зносіны.

Значыць, далучэнне дэзадаптаваных людзей да творчасці будзе стымуляваць развіццё ў іх здольнасцей у поўнай меры, таму што творчая дзейнасць выступае, з аднаго боку, як сродак актывізацыі і ўмацавання ўласцівасцей і здольнасцей, неабходных у іншых відах дзейнасці, з другога – як спецыфічная форма пазнання рэчаіснасці, неад'емная частка культуры, без авалодання якой немагчымая актыўная сацыяльная дзейнасць.

Мэтам і задачам гештальттэрапіі, па нашым меркаванні, найбольш адпавядаюць Дамы (цэнтры) рамёстваў, якія маюць прыстасаваныя да творчай дзейнасці будынкі, класы, майстэрні. Яны ў параўнанні з сельскімі клубамі лепш забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі, абсталяваннем і інструментам, неабходнымі матэрыяламі і сыравінай, метадычнай літаратурай па рамёствах. Менавіта гэтым тлумачыцца шырокае распаўсюджванне ў 90-я гады ў даследуемым соцыуме самадзейнай мастацкай творчасці, якая характарызавалася значнымі зместавымі, вобразна-пластычнымі і тэхніка-выканаўчымі дасягненнямі ў засваенні набытага багажу народнага мастацтва, атрыманні яго ў спадчыну, пераасэнсаванні і далейшым развіцці з пазіцыі сённяшніх патрабаванняў жыцця.

**Е.В.Шедова**, аспирантка
Белорусского университета культуры

## КОМЕДИЙНЫЕ ЖАНРЫ В СОВРЕМЕННОЙ МУЗЫКАЛЬНО-ТЕАТРАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЕ БЕЛАРУСИ (теоретический аспект)

Развитие музыкально-театральной культуры Беларуси отмечено преобладанием на всех его этапах произведений с яркими комедийными сюжетами, жанров комедийного плана, отвечающих характеру так называемого "театра представления". Обращение к комедий-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ